











# Пачатак чалавечага смутку



Пачатак чалавечага смутку

Гісторыя з Божага Слова, Бібліі

знаходзіцца ў

Быццё 3-6

"Сведчанне словаў Тваіх прасвятляе."
Псалтыр 119:130

Аўтар Edward Hughes
Ілюстратар Byron Unger; Lazarus

Пераклаў Christian Lingua
Адаптаваў M. Maillot; Tammy S.

**Гісторыя 2 з 60**

**M1914.org**

**Bible for Children, PO Box 3, Winnipeg MB R3C 2G1 Canada**

Ліцэнзія: Вы маеце права капіяваць ці друкаваць гэтую гісторыю, але не ў камерцыйных мэтах (не прадаваць яе).

Бог ведае, што мы рабілі дрэнныя справы, якія Ён называе грахом. Пакаранне за грэх – гэта смерць.

Бог любіць нас так моцна, што Ён паслаў Свайго Сына, Ісуса, каб памерці на крыжы і аплаціць нашае пакаранне замест нас. Ісус уваскрэс з мёртвых і вярнуўся на нябёсы! Цяпер Бог можа прабачыць нашыя грахі.

Калі вы хочаце адвярнуцца ад вашых грахоў, тады скажыце Богу: Гасподзь, я веру, што Ісус памёр за мяне і цяпер зноў жывы. Калі ласка, увайдзі ў маё жыццё і прабач мае грахі, каб я мог мець новае жыццё цяпер, а потым быць з Табой назаўжды. Дапамажы мне жыць для Цябе, як Тваё дзіцё. Амін. Ян 3:16

Чытайце Біблію і размаўляйце з Богам кожны дзень!

Беларуская — Belarusian







“Ці сказаў вам Бог ня есці ад усялякага дрэва?” – запытаў змей Еву. “Мы можам есці ад усялякага дрэва, акрамя аднаго”, – адказала яна, – “Калі мы з’ямо плод ад гэтага дрэва ці нават кранёмся яго, мы памром”. “Вы не памраце...” – ухмыльнуўся змей.
3
“Вы станеце як Бог”. Еве вельмі захацелася пакаштаваць. Яна паслухалася змея і з’ела плод.
4
Пасля таго, як Ева не паслухалася Бога, яна прывяла і Адама пакаштаваць плод. Адам павінен быў сказаць: “Не! Я буду слухацца Божага Слова”.
5
Калі Адам і Ева зграшылі, яны абодва дазналіся, што голыя. Каб пакрыць сябе, яны пашылі фартухі з фігавага лісця. Потым яны схаваліся ад Божай прысутнасці ў кустах.
6
Падчас вячэрняй прахалоды Бог прыйшоў у сад. Ён ведаў, што зрабілі Адам і Ева. Адам абвінаваціў Еву. Ева абвінаваціла змея. Бог сказаў: “Змей пракляты. А жанчына будзе адчуваць боль падчас нараджэння дзяцей”.
7
“Адам, зямля будзе праклятая з-за таго, што вы зграшылі. Яна пакрыецца шыпамі і чартапалохам. Ты будзеш цяжка працаваць і пацець, каб атрымаць ежу на дзень”.
8
Бог выдаліў Адама і Еву з цудоўнага саду. З-за свайго граху яны разлучыліся з Богам, які дае жыцця! Бог стварыў агністы меч, каб трымаць іх найдалей ад саду.
9
Таксама Бог стварыў скуранае адзенне для Адама і Евы. Але адкуль Бог узяў скуру для яго?
10
З цягам часу ў Адама і Евы нарадзілася сям’я. Каін, іх першы сын, вырошчваў расліны. Авель, іх другі сын, быў пастухом.
11
Аднойчы Каін прынёс Богу ў падарунак сваю гародніну. Авель, у сваю чаргу, падараваў Богу самых лепшых сваіх авечак. Бог быў задаволены падарункам Авеля.
12
Бог не быў задаволены падарункам Каіна. Тады Каін вельмі раззлаваўся. Але Бог сказаў: “Калі ты робіш тое, што правільна, ці не будзеш прыняты?”
13
Аднак гнеў Каіна не сыходзіў. Праз некаторы час ён напаў на Авеля ў полі – і забіў яго!
14
Бог сказаў Каіну: “Дзе брат твой, Авель?” “Я не ведаю” – схлусіў Каін, – “хіба я вартаўнік майму брату?” Бог пакараў Каіна, пазбавіўшы яго магчымасці вырошчваць гародніну, і зрабіў яго вандроўнікам.
15
Каін выйшаў з прысутнасці Госпада. Ён ажаніўся з дачкой Адама і Евы, і яны стварылі сям’ю. Неўзабаве, унукі і праўнукі Каіна запоўнілі заснаваны ім горад.
16
Між тым, сям’я Адама і Евы таксама хутка расла. У тыя часы людзі жылі значна даўжэй, чым сёння.
17
Калі ў Евы нарадзіўся сын Сіф, яна сказала, “Бог даў мне Сіфа замест Авеля”. Сіф быў набожным чалавекам, ён пражыў 912 гадоў і меў шмат дзяцей.
18